Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

5 ЛІПЕНЯ 2016 г. АЎТОРАК № 127 (28237)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Дзе можна набыць экапрадукцыю?**

СТАР. 9




**Звярынае царства... на грашах**

СТАР. 10



**Гістарычны навігатар па Магілёўшчыне**

СТАР. 11

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Ігар БУЗОЎСКІ, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта:**

*«Грамадства зацікаўлена, каб у склад парламента ўвайшлі падрыхтаваныя людзі — у прававой, палітычнай, эканамічнай і іншых галінах. Высокі прафесіяналізм патрабуецца і ад тых, хто будзе працаваць у выбарчых камісіях, хто стане назіральнікамі. Стабільная сітуацыя ў дзяржаве дазволіць правесці выбарчую кампанію на высокім прафесійным арганізацыйным узроўні, у строгай адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і ў інтарэсах грамадзян нашай краіны».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 05.07.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9979 | ▼ |
| Еўра | 2,2207 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0313 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0804 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# Залацісты пасаг



Фота БЕЛТА.

Міла БУГАЕВА з Рагачова — уладальніца ці не самай доўгай у краіне касы. Даўжыня яе шыкоўных валасоў колеру медзі — без малога паўтара метра. Дзяўчына — будучы юрыст, неўзабаве збіраецца замуж за кадравага ваеннага. Яе жаніх Арцём БЕДНЯКОЎ ганарыцца сваёй прыгожай нявестай і яе шыкоўным «пасагам».

**Міхаіл МЯСНІКОВІЧ:**

## «МЫ МОЖАМ СТВАРАЦЬ ТРАНСНАЦЫЯНАЛЬНЫЯ КАРПАРАЦЫІ»

**Беларусь і Расія павінны дапоўніць адна адну для паспяховага сумеснага выхаду на сусветныя рынкі**



**Калі мы шмат працуем, але жывём не так багата, як хацелася б, значыць, наша праца не запатрабавана. Каб змяніць сітуацыю, мы павінны ўвесь час азірацца. На тое, што і як робяць іншыя, з кім варта аб'яднаць свае намаганні, у каго нечаму навучыцца, дзе наш прадукт будзе больш запатрабаваны. Неабходна адначасова бачыць увесь свет з яго настроямі, напрамкамі руху, праблемамі і знаходкамі. Мы ўвесь час павінны імкнуцца ў лідары. Іншага не дадзена. Гэта цяжка. Але ёсць адзін правераны спосаб, які ў гэтым дапамагае — супрацоўніцтва. Ён няпросты, але сапраўды працуе. І рэгіянальнае супрацоўніцтва Беларусі і Расіі — пераканаўчы таму доказ. Няма моўных бар'ераў, ёсць воля палітыкаў і зацікаўленасць бізнесу. Плюс «зялёнае святло» з боку заканадаўства і празрыстыя межы. Менавіта пра беларуска-расійскае рэгіянальнае супрацоўніцтва наша размова са Старшынёй Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаілам МЯСНІКОВІЧАМ.**

СТАР. 4

■ Абітурыент-2016

## ТЭСТЫ — УДАСКАНАЛЬВАЮЦЦА. ВЕДЫ — ПАЛЯПШАЮЦЦА?

**Фізіка — традыцыйна адна з самых складаных дысцыплін на ЦТ — аказалася сёлета багатай на 100-бальныя вынікі. Максімум на экзамене атрымалі 34 абітурыенты (у 2015 годзе такіх шчаслівіцаў было ўсяго 7 чалавек).**

— Наяўнасць стабальных вынікаў сведчыць пра даступнасць тэстаў і іх адпаведнасць патрабаванням праграм уступных выпрабаванняў, — пракаментаваў папярэднія вынікі тэсціравання **міністр адукацыі Міхаіл ЖУРАЎКОЎ**. — 32 «стабальнікі» скончылі навучальныя ўстановы ў бягучым годзе.

Міхаіл Жураўкоў расказаў, што выпускнікоў 2016 года сярод удзельнікаў тэсціравання па фізіцы было 65,5% ад агульнай колькасці. Найлепшыя вынікі прадэманстравалі ліцэісты (іх сярэдні бал — 53,41) і гімназісты (47,3). А сярэдні бал выпускнікоў агульнаадукацыйных школ — 26,2.

СТАР. 5